Источник: "Звезда" - 2019-07-13

Актуальна

# ПЕРАМОГА КАВАЛАСЯ Ў БЕЛАРУСІ!



**Гэты баявы вопыт вывучаюць гісторыкі ўсяго свету. Аперацыя «Баграціён» стала не толькі адной з самых буйных ваенных падзей у гісторыі (так, з савецкага боку ў ёй было задзейнічана 1,5 мільёна савецкіх салдат і афіцэраў плюс больш чым трыста тысяч партызан), падчас яе савецкае камандаванне апрабавала новыя метады вядзення вайны.**

Што адбывалася на беларускай зямлі ў 1944 годзе і які ўнёсак аперацыі ў сусветную гісторыю і канчатковую перамогу ў Другой сусветнай вайне, абмяркоўвалі вучоныя падчас канферэнцыі, якая была арганізавана Нацыянальнай акадэміяй навук, Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь, Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі РБ, Нацыянальным архівам.

У канферэнцыі прыняло ўдзел каля пяцісот вучоных — гісторыкаў і архівістаў Беларусі, Расіі, Арменіі, Азербайджана, Германіі, Літвы, прадстаўнікі сілавых ведамстваў, студэнты і курсанты грамадзянскіх і ваенных навучальных устаноў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. На форуме абмяркоўваліся найактуальнейшыя пытанні, найноўшыя дасягненні вучоных, прэзентаваліся вынікі апошніх даследаванняў і кнігі, якія падрыхтавалі гісторыкі. Сярод тэм, якія хвалююць сучасных даследчыкаў, праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, нацысцкая акупацыйная палітыка, партызанскі рух і падпольная барацьба на акупаванай тэрыторыі Беларусі, савецкае ваеннае мастацтва падчас Другой сусветнай вайны.



Як заўважыў **дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ**, такія маштабныя форумы дазваляюць трансліраваць наш погляд на гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, супрацьстаяць спробам фальсіфікацыі мінулага і выпрацоўваць імунітэт супраць такіх спроб, бо ў падобных мерапрыемствах прымаюць удзел не толькі вучоныя, але і моладзь.



Да падрыхтоўкі мерапрыемства падключыліся многія арганізацыі, у межах канферэнцыі дэманстраваліся ўнікальныя архіўныя дакументы, літаратура, якая выдавалася ў часы Вялікай Айчыннай вайны, а таксама экспанаты, якія прывёз Бягомльскі краязнаўчы музей.

У час канферэнцыі бібліятэка Акадэміі навук папоўнілася каштоўнымі экспанатамі — дырэктар нямецкага выдавецтва ENOS Клаўс-Дзітар Цэнтграф перадаў нумары газеты «Чырвоная Армія», якія былі надрукаваны ў 1944 годзе і сведчаць пра вызваленне вялікіх тэрыторый падчас аперацыі «Баграціён». Ваенныя журналісты, якія выдавалі гэту газету, падарожнічалі разам з часцямі Чырвонай Арміі, асвятлялі ваенныя падзеі, якія адбываліся ў той час. Газеты праехалі праз палову Еўропы, а пасля заканчэння вайны падшыўка некалькі дзесяцігоддзяў захоўвалася ў Германіі. Таксама некалькі нумароў газеты «Чырвоная Армія» нямецкі даследчык перадаў у Беларускі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**